# Раздзел VII

# КРЫТЫКА Ў СМІ
# ЯК ЧАСТКА МЕДЫЯКУЛЬТУРЫ

## ІНТЭРНЭТ ЦІ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ? ФАКТЫ З ГІСТОРЫІ МАСТАЦТВА Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ІНТЭРНЭТУ

***Г. Б. Багданава***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*galina bagdanava@mail.ru*

У артыкуле прааналізавана дакладнасць падачы фактаў з гісторыі мастацтва ў інтэрнэце. Даводзіцца неабходнасць супастаўлення інтэрнэтаўскай і зафіксаванай у энцыклапедычных выданнях інфармацыі. Артыкул будзе карысным для журналістаў, выкладчыкаў, студэнтаў, усіх, хто цікавіцца мастацтвам.

***Ключавыя словы:*** мастацтва; інтэрнэт; інфармацыя; дакладнасць; інтэрпрэтацыя.

## INTERNET OR ENCYCLOPEDIA? FACTS FROM THE HISTORY OF ART IN THE INFORMATION SPACE OF THE INTERNET

***G. B. Bagdanava***

*Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: G. B. Bagdanava (galina bagdanava@mail.ru)*

The article analyzes the reliability of the presentation of facts from the history of art on the Internet. There is a need to compare the Internet and recorded in encyclopedic publications information. The article will be useful for journalists, teachers, students, anyone interested in art.

***Keywords:*** art; Internet; information; accuracy; interpretation.

Выяўленчае мастацтва на сёння з’яўляецца адным з самых запатрабаваных відаў мастацтва. Правядзенне шматлікіх выставак як класічнага, так і сучаснага мастацтва, кінафільмы і спектаклі, прысвечаныя яркім мастацкім асобам, актывізацыя дзейнасці музеяў (квэсты, «ноч музеяў» і г. д.), выданне цудоўна ілюстраваных кніг і альбомаў вымагаюць ад журналістаў, тых, хто займаецца рэкламай, дакладных і адначасова дастаткова шырокіх ведаў па гісторыі мастацтва не толькі мінулых стагоддзяў, але і сучаснасці.

Публікацыі па выяўленчым мастацтве з’яўляюцца не толькі ў спецыялізаваных, але і практычна ва ўсіх перыядычных выданнях, на радыё, тэлебачанні, у інтэрнэце. Каляровы друк дазваляе рэпрэзентаваць найбольш цікавыя творы выяўленчага мастацтва, дае магчымасць чытачу, патэнцыяльнаму наведвальніку выстаўкі, параўнаць сваё ўражанне з тым, якім дзеліцца аўтар матэрыялу.

Большасць журналістаў у пошуках інфармацыі сёння звяртаецца да інтэрнэту. Мы прааналізавалі інфармацыйныя рэсурсы такіх папулярных пошукавых сістэм, як «Яндэкс» і «Гугл», супаставілі змешчаныя там факты з тым, як падаюцца яны ў энцыклапедычных выданнях. Што датычыцца гісторыі мастацтва даўніх часоў, большасць фактаў, несумненна, узята з энцыклапедычных выданняў, манаграфій, на якія могуць рабіцца спасылкі. Але факты з гісторыі найноўшага часу (канца XIX–XX, XXI стагоддзяў) яшчэ толькі асэнсоўваюцца мастацтвазнаўцамі, гісторыкамі мастацтва, і таму часта трапляюць у інтэрнэт з дастаткова суб’ектыўнай ацэнкай. У той час як рэдакцыі энцыклапедычных выданняў імкнуцца нават факты апошніх дзесяцігоддзяў падаваць як мага больш аб’ектыўна. Для гэтага ёсць рэдкалегія, рэдакцыйны савет, кожны артыкул рэцэнзуецца спецыялістамі. Праўда, некаторыя энцыклапедычныя выданні апошніх гадоў, хаця і добра праілюстраваныя, бяруць звесткі з таго ж інтэрнэту і такім чынам суб’ектывізуюць інфармацыю.

Для прыкладу звернемся да ці не найбольш запатрабаванай сёння старонкі з гісторыі мастацтва – накірункі і плыні XX стагоддзя. З уласнага вопыту можам засведчыць, што найбольш лагічна сістэматызаваная і выдатна ілюстраваная інфармацыя змешчана ў 7 томе «Энцыклапедыі для дзяцей», выдадзенай выдавецтвам «Аванта+» у 2000 годзе [1]. Папярэдні, 6 том прысвечаны мастацтву да XVII стагоддзя. Звесткі па беларускім мастацтве можна адшукаць як у 18-томнай «Беларускай энцыклапедыі» [2], так і ў 6-томнай «Гісторыі беларускага мастацтва» [3].

Але сістэматызаваную і лагічна абгрунтаваную падачу інфармацыі пра плыні ХХ стагоддзя мы знойдзем у вышэйназванай «Энцыклапедыі для дзяцей» [1].

Звернемся да інтэрнэту. Набіраем «Асноўныя плыні ў выяўленчым мастацтве ХХ стагоддзя». Найбольш зручнай для карыстання можа падацца табліца, дзе да кожнай плыні ёсць тлумачэнне – «што гэта такое», «хто і калі», «як распазнаць», «карціны», «у Расіі». Структура даволі зручная.

Але, па-першае, тут названы далёка не ўсе плыні. Толькі фавізм, экспрэсіянізм, кубізм, футурызм, (неа)прымітывізм, экспрэсіўная абстракцыя, геаметрычная абстракцыя, Ар-дэко, поп-арт, фотарэалізм (гіперрэалізм), канцэптуалізм. Для параўнання – у «Энцыклапедыі для дзяцей» вызначаны і праілюстраваны яшчэ такія важныя плыні, як метафізічны жывапіс, пластыцызм, оп-арт, аналітычны жывапіс, супрэматызм, постмадэрнізм, і іншыя.

Па-другое, не зусім карэктна даюцца азначэнні і тлумачэнні.

Для прыкладу: «Фавізм называюць першай авангарднай плынню, хоць яго можна лічыць і часткай постымпрэсіянізму. Гэта бунтарскі, але яшчэ фігуратыўны (які паказвае рэальныя прадметы) кірунак, які адмовіўся і ад большасці папярэдніх жывапісных нормаў, і ад ідэі, што мастацтва павінна выказваць філасофскія, інтэлектуальныя сэнсы. Замест гэтага галоўнымі сталі эмоцыі – часцей за ўсё яркія, радасныя, – якія павінны былі быць выяўлены на мове фарбаў. Прыёмы фавістаў, асабліва яркі колер, плоскаснасць і цёмны контур, паўплывалі на многіх мастакоў ХХ стагоддзя» [4].

У «Энцыклапедыі для дзяцей»: «Фавізм (ад франц. *fauve* – “дзікі”) – плынь у французскім жывапісе пачатку ХХ ст., для якой характэрна гранічна інтэнсіўнае гучанне адкрытых колераў, супастаўленне кантрасных афарбаваных плоскасцей, заключаных у абагульнены контур, звядзенне формы да простых абрысаў пры адмаўленні ад светлаценевай мадэліроўкі і лінейнай перспектывы» [1, с. 640].

І, па-трэцяе, абраныя інтэрнэтаўскімі аўтарамі плыні практычна не былі прадстаўлены ў Расіі. Напрыклад, у Расіі кубізму і футурызму ў чыстым выглядзе практычна не было, затое склаўся «кубафутурызм». Што ж датычыць такога накірунку, як «аналітычнае мастацтва», пра які не згадваецца, то яго развіваў рускі мастак П. Філонаў. А «супрэматызм» – галоўны накірунак у творчасці К. Малевіча. У кнізе «Вялікія мастакі ХХ стагоддзя» для аднаго з маскоўскіх выдавецтваў мы палічылі магчымым змясціць спецыяльны слоўнік практычна ўсіх плыняў з азначэннямі [5].

Толькі валодаючы дакладнай тэарэтычнай інфармацыяй, арт-журналіст можа прапаноўваць сваю ўласную інтэрпрэтацыю ўспрымання таго або іншага твора ці вобраза.

Што датычыцца беларускамоўных сайтаў, тут асноўныя накірункі выяўленчага мастацтва ў XX стагоддзі пакуль што не сістэматызаваны. Хаця можна было б не толькі даць інфармацыю пра еўрапейскія накірункі, але і пазнаёміць з накірункамі ў беларускім мастацтве XX – пачатку XXI стагоддзяў. У прыватнасці, вельмі цікава развіваюцца на Беларусі такія плыні, як постмадэрнізм і постпостмадэрнізм (у беларускім мастацтвазнаўстве ўжываецца тэрмін «посттрадыцыя»). Нагадаем, што калі ў постмадэрнізме творца можа выкарыстаць у сваім творы вобразы з культуры розных краін і розных часоў, прадстаўнікі постпостмадэрнізму (посттрадыцыі) абіраюць пэўную традыцыю (рэалізм, кубізм, сюррэалізм і г. д.) як камертон свайго твора, тым самым гарманізуюць прастору палатна. Мастацтвазнаўцы праводзяць паралель з накірункамі канца XIX стагоддзя эклектызмам і мадэрнам.

Калі мы звернемся да сучаснага мастацтва, да культурных з’яў апошніх гадоў, тут інтэрнэт вельмі часта звяртаецца да перыядычнага друку, інфармацыйных рэсурсаў тэлебачання. Хаця варта адзначыць, што аператыўнасць і багатая ілюстрацыйнасць інтэрнэту пераўзыходзіць магчымасці друкаваных выданняў. І да таго ж, інтэрнэт мае магчымасць прадставіць вялікі аб’ём інфармацыі. Да прыкладу, пра тое, што адбывалася на вернісажы такіх выставак, як «“Восеньскі салон” з Белгазпрамбанкам» (2016, 2017, 2018 гады), або «Трыенале маладых мастакоў» (2019 год), а потым пра тое, хто быў прызнаны лепшым мастаком і ўзнагароджаны, найперш можна было дазнацца з інтэрнэту. Чаго не хапала ў гэтых паведамленнях, дык гэта прафесійных каментарыяў. Творы сучаснага мастацтва патрабуюць ключоў для іх разумення. Але для гэтага ўсе, хто піша або расказвае пра сучаснае мастацтва, мусяць выдатна арыентавацца ў яго гісторыі. І тут не абысціся без сістэматызаванай кароткай дакладнай гісторыі мастацтва, без слоўніка тэрмінаў з ілюстрацыямі, без кароткіх звестак пра вядомых мастакоў. Інфармацыйная прастора інтэрнэту вымагае журналістаў – прафесіяналаў у розных сферах, у тым ліку і ў сферы мастацтва.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Энциклопедия для детей. Т. 7. Искусство. Ч. 2. М. : Аванта+, 2000.
2. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск : Беларуская энцыклапедыя, 1995–2003.

3. Гісторыя беларускага мастацтва: у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў (гал. рэд.) [і інш.]. АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994.
4. Арт-ликбез: что такое фовизм и чем его пишут? [Электронный ресурс]. URL: brunch.lv/art-likbez-chto-takoe-fovizm-i-chem-ego-pishut (дата обращения: 01.09.2019).
5. Великие художники XX века / авторы-составители: П. С. Богданов, Г. Б. Богданова. М. : Мартин, 2001. 479 с.

# СУЧАСНАЕ МАНУМЕНТАЛЬНА-ДЭКАРАТЫЎНАЕ МАСТАЦТВА Ў ІНФАРМАЦЫЙНАЙ ПРАСТОРЫ ІНТЭРНЭТУ

***А. П. Багданаў***

*Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў,*
*пр. Незалежнасці, 81, 220012, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*donald-bogdanov@mail.ru*

Манументальна-дэкаратыўнае мастацтва – адзін з самых запатрабаваных на Беларусі і ў іншых краінах відаў сучаснага мастацтва. У артыкуле аналізуецца, наколькі адэкватна прадстаўлена манументальна-дэкаратыўнае мастацтва ў прасторы інтэрнэту. Даюцца канкрэтныя парады па ўдасканаленні інфармацыйных рэсурсаў, дакладнасці прадстаўленай інфармацыі. Артыкул дапаможа выкладчыкам, настаўнікам, студэнтам, вучням, журналістам і ўсім, хто цікавіцца мастацтвам, арыентавацца ў тэарэтычным і практычным аспектах рэпрэзентацыі твораў манументальна-дэкаратыўнага мастацтва.

***Ключавыя словы:*** манументальна-дэкаратыўнае мастацтва; інтэрнэт.

# MODERN MONUMENTAL AND DECORATIVE ART IN THE INFORMATION SPACE OF THE INTERNET

***A. P. Bagdanau***

*Belarusian state Academy of arts,*
*4, Nezalezhnasci Av., 220030, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: A. P. Bagdanau (donald-bogdanov@ mail.ru)*

Monumental and decorative art is one of the most popular types of contemporary art in Belarus and other countries. The article analyzes how adequately represented monumental and decorative art in the space of the Internet. Specific advice on improving information resources, the reliability of the information pro-